что власть не обращала особого внимания на органы печати, не заботилась об их развитии, об усилении их роли в обществе.

«Сибирская газета» кардинально изменила существующий порядок вещей. Власть обратила внимание на журналистику, на ее возможности, и по-новому оценила газеты, которые оказывали поддержку ее действиям. В свою очередь частная газета способствовала тому, что государственные институты стали подвергаться общественному контролю, и это привело к большей эффективности их работы. Достижения дореволюционной журналистики востребованы и в современной России, в которой в постоянном взаимодействии находится журналистика частная и официальная, критикующая и поддерживающая власть.

**Наталля Зубчонак**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

## «КРАСНЫЙ СТУДЕНТ» ПРА ПЕРШЫ ГОД ПРАЦЫ РАБФАКА БДУ

У чэрвені 1921 г. была адчынена першая вышэйшая навучальная ўстанова ў БССР – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Рабочы факультэт у складзе 160 слухачоў прыняў новае пакаленне будучых інжынераў, настаўнікаў, юрыстаў, эканамістаў, літаратараў, навукоўцаў, дзяржаўных дзеячаў, якім было наканавана будаваць новую краіну. Вітаючы слухачоў, наркам асветы У. Ігнатоўскі адзначыў: «Для гэтай мэты і быў утворан рабоча-сялянскі факультэт, каторы зрабіўся для працоўнай масы тымі сходамі, каторыя вядуць рабочаго і селяніна да вышэйшай навукі. Праз яго массы будуць паступова запоўняць аўдзіторыі, лабораторыі, кабінэты і бібліотэкі нашага новага універсітэту. Утворыцца новы тып студэнцтва, вышэдшага ад сахі і станка, для якога інтарэсы пралетарията і селянства будуць ўласнымі інтарэсамі» [1].

Пасля непрацяглага вучэбнага перыяду і перапынку на летнія канікулы быў праведзены другі прыём студэнтаў колькасцю 125 чалавек. На аснове Палажэння аб Рабочых факультэтах, зацверджанага Галоўпрафадукацыяй РСФСР, паступова была сфарміравана арганізацыйная структура новай навучальнай установы – абраны прэзідыум, арганізаваны Савет, прадметныя камісіі, створаны студэнцкія арганізацыі.

У 1922–1923 навучальным годзе агульная колькасць слухачоў на факультэце складала 400 чалавек, з іх 320 чалавек рабочых, 80 земляробаў;

адкамандзіраваных прафсаюзамі – 169, РКП – 92, РКСМ – 36, іншымі арганізацыямі – 80.

Прыём ва ўніверсітэт праводзіла асобная мандатная камісія, у склад якой уваходзілі прадстаўнікі ЦВК, ЦБ, Савпрафбела і КСМ. Камісія персанальна абмяркоўвала кожную кандыдатуру. Працавала яна ў адпаведнасці з інструкцыяй, выдадзенай аддзелам Рабфакаў РСФСР.

Акрамя гэтага, у лютым 1922 г. была праведзена агульная праверка студэнцтва на падставе прадпісання аддзелаў Рабфакаў, якая адлічыла з факультэта 31 чалавека па наступных прычынах: а) няяўка на працягу месяца без уважлівай прычыны, б) прапусціўшыя больш за 14 дзён за апошнія 2 месяцы, в) асобы не фізічнай працы, г) непадрыхтаванасць і разумовая адсталасць [2].

Навучальны працэс ажыццяўляўся ў адпаведнасці з вучэбным планам Аддзела Рабфакаў. Падрыхтоўка ажыццяўлялася па трох спецыялізацыях: тэхнічнай, біялагічнай і грамадска-эканамічнай. Была прынята трыместравая сістэма. Працягласць трыместраў: асенні – 4 мес., зімовы – 4 мес., вясенні – 2 мес.

На працягу навучальнага года на рабфаку была добра арганізавана ідэалагічна-выхаваўчая работа. Слухачы наведвалі заняткі ў гуртках па гістарычнаму матэрыялізму, літаратуры, прыродазнаўству і палітычнай эканоміі. Пазней былі арганізаваны гурткі па тэхніцы чытання, палітасветы, харавы, музычны, драматычны. Вялася падрыхтоўка да выпуску перыядычных выданняў.

Першыя выданні БДУ выйшлі ў другім паўгоддзі 1921–1922 навучальнага года. Пачаўся выпуск часопіса «Красный студент». У 1922 г. было надрукавана толькі два нумары. У гэты ж перыяд быў арганізаваны выхад штодзённай газеты «Голос рабфаковца». Адзін са слухачоў рабфака (Трубач) пісаў пра гэта так: «Некалькі начэй рабфакаўцы-друкары з дапамогай іншых камсамольцаў, забываючыся на сон, працавалі над газетай. Але юная энергія перамагла ўсё і “Голос” у тысячу экземпляраў выйшаў у свет. Праз ЦККСМБ, Савпрафбел” і іншыя органы мы бясплатна яе распаўсюдзілі сярод рабочых, сялян і моладзі Беларусі» [3].

Складаным заставалася і матэрыяльнае палажэнне факультэта. Студэнты разам з выкладчыкамі наладжвалі быт – праводзілі рамонт інтэрната, нарыхтоўвалі дровы для яго ацяплення. Арганізавалі працу па будаўніцтву сталовай. Сваімі сіламі стварылі швейную майстэрню, дзе адзенне можна было адрамантаваць бясплатна, а пашыць новае за невялікі кошт.

У справаздачы «Вынікі года», якая была падрыхтавана да ўрачыстага святкавання «Дня рабфакаў» (адзначаўся 17 верасня), было падкрэслена: «… адкрыццё ў Мінску Дзяржаўнага ўніверсітэта з'яўляецца першым камянём у пабудове культурнага цэнтра Беларусі. Бясспрэчна, што рабочаму факультэту многага яшчэ не хапае ў галіне матэрыяльнага абсталявання і стварэння неабходных умоў для вучэбных заняткаў, але ёсць ужо галоўнае, гэта агульнае ўсведамленне, што ў яго сценах ажыццяўляецца культурная справа прыцягнення да навукі шырокіх слаёў рабочага і сялянскага насельніцтва, якім упершыню адкрыта дарога да святла і ведаў» [4].

Дзейнасць першых перыядычных выданняў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта сёння вывучана недастаткова поўна. Выключэнне складаюць даследаванні па гісторыі беларускага друку, праведзеныя на кафедры гісторыі журналістыкі Інстытута журналістыкі БДУ прафесарам А.Г. Слукой (серыя падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў пад агульнай назвай «Беларуская журналістыка»).

Няшмат экземпляраў газет і часопісаў захавалася да нашага часу. Але ў гэтым і заключаецца іх неперагаўзыйдзеная каштоўнасць, бо іх матэрыялы – крыніца важнай інфармацыі, рэальнай гісторыі станаўлення і развіцця галоўнай навучальнай установы нашай краіны.

Значную каштоўнасць для вывучэння гісторыі БДУ на сённяшні дзень прадстаўляюць матэрыялы Зборніка Рабочага факультэта пад назвай «Красный студент». Па афіцыйных звестках, у 1922 г. быў надрукаваны адзіны нумар гэтага альманаха. Больш выданне не выпускалася, хутчэй за ўсё, па матэрыяльных прычынах. Яно выйшла ў Мінску ў друкарні Прафтэхшколы. На жаль, не захаваліся звесткі пра тыраж. Аб'ём зборніка складае 60 старонак звычайнага часопіснага фармату. Дадзенае выданне ўпамінаецца ў артыкуле-справаздачы намесніка рэктара БДУ па адміністрацыйных пытаннях прафесара С.З. Кацэнбогена (пазней дэкана факультэта грамадскіх навук) [5].

Змест альманаха прадстаўле сабой своеасаблівы летапіс развіцця рабфака БДУ у першы год працы. У прадмове ад рэдакцыі адзначалася: "Задачай сапраўднага зборніка з'яўляецца азнаямленне з працай, зробленай на працягу 17 месяцаў існавання аднаго з найбольш маладых рабфакаў – рабфака пры Беларускім Дзяржаўным Універсітэце, а ў шэрагу нарысаў і артыкулаў, напісаных слухачамі, мы жадаем даць прыблізную карціну жыццёвай абстаноўкі і ўнутранай настроенасці новага студэнцтва» [6].

У 1923 г. пачынаеццца новы этап станаўлення Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У яго структуры з'яўляюцца новыя факультэты – факультэт грамадскіх навук, педагагічны і медыцынскі. Пра іх дзейнасць пісалі ўжо іншыя перыядычныя выданні, не менш цікавыя і каштоўныя.

*Літаратура*

1. Красный студент. Сборник Рабочего факультета при Белорусском Государственном Университете. – Минск – 1922. – с. 6.
2. Красный студент. Сборник Рабочего факультета при Белорусском Государственном Университете. – Минск – 1922. – с. 8.
3. Красный студент. Сборник Рабочего факультета при Белорусском Государственном Университете. – Минск – 1922. – с. 15.
4. Красный студент. Сборник Рабочего факультета при Белорусском Государственном Университете. – Минск – 1922. – с. 16.
5. Красный студент. Сборник Рабочего факультета при Белорусском Государственном Университете. – Минск – 1922. – с. 236.
6. Красный студент. Сборник Рабочего факультета при Белорусском Государственном Университете. – Минск – 1922. – с. 3.

**Ольга Касперович**
*Белорусский государственный университет*

## ЭФФЕКТИВНОСТЬ МЕДИАТЕХНОЛОГИЙ В СОВРЕМЕННЫХ УСЛОВИЯХ

Феномен медиатехнологий в современном мире представляет синергию диалектико-материалистических идей философской концепции деятельности, который включает системный, синергетический, эволюционный и информационный аспекты.

Медиатехнологии можно понимать в узком и широком смысле. В узком смысле медиатехнологии представляют собой организацию технической деятельности, а также совокупность (систему) правил, методов работы с информацией. В широком смысле медиатехнологии связаны не только с техникой, но и с цивилизационными завоеваниями и представляют собой сферу целенаправленных усилий, существенно детерминируемых рядом социокультурных факторов.

Прежде всего, медиатехнологии представляют собой техническую форму освоения человеком окружающей его действительности. Медиатехнологии относятся к междисциплинарному феномену и классифицируются по различным критериям. Одним из таких критериев является